Belarus - Абарона Пісаньне - Protection Scriptures

Езэкііл 3:18 - Якуба 5:19,20 Браты, калі хто з вас ухіліўся ад праўды, і нехта наверне яго, 20. няхай ведае, што той, які навярнуў грэшніка з памылковага шляху ягонага, збавіць душу ад сьмерці і прыкрые мноства грахоў.

Рымлянаў 12:21 Ня будзь пераможаны злом, але перамагай зло дабром.

Псальмаў 143:8,10 - Яна 14:26 Абаронца ж, Дух Сьвяты, Якога пашле Айцец у імя Маё, навучыць вас усяго і нагадае вам усё, што Я казаў вам.

Псальмаў 94:12 - Яна 16:13 Калі ж прыйдзе Ён, Дух Праўды, то будзе весьці вас да ўсякае праўды, бо не ад Сябе гаварыць будзе, але будзе гаварыць тое, што пачуе, і абвесьціць вам, што мае прыйсьці.

Прыповесьці 27:12 Разумны бачыць зло і хаваецца, а неразумныя ідуць і будуць пакараныя.

Філіпянаў 2:16 захоўваючы слова жыцьця, на пахвалу маю ў дзень Хрыстовы, што я не надарма бег і не надарма працаваў.

Ісая 49:4 - Галятаў 4:11 Баюся за вас, ці не надарма я працаваў у вас.

Гебраяў 13:21 няхай удасканаліць вас у-ва ўсякай справе добрай, дзеля выкананьня волі Ягонай, робячы ў вас тое, што даспадобы Яму, праз Ісуса Хрыста, Якому слава на вякі вякоў. Амэн.

1 Карыньцянаў 16:15 Прашу ж вас, браты: вы ведаеце дом Стэфана, што ён ёсьць пачатак Ахаі і што яны аддалі сябе на служэньне сьвятым;

Філіпянаў 1:27 Толькі жывіце дастойна Эвангельля Хрыстовага, каб мне, ці як прыйду і ўбачу вас, ці адсутны, чуць пра вас, што вы стаіцё ў адным духу, змагаючыся аднадушна за веру Эвангельскую.

1 Карыньцянаў 15:58 Так што, браты мае ўлюбёныя, будзьце непарушныя, непахісныя, у справе Госпадавай мейце рупнасьць заўсёды, ведаючы, што праца вашая не дарэмная перад Госпадам.

Каласянаў 4:12 Вітае вас Эпафрас, які з вашых, слуга Хрыста, які заўсёды змагаецца за вас у малітвах, каб вы стаялі дасканалымі і напоўненымі ўсякай воляй Божай.

Ярэмію 15:20 - Рымлянаў 8:31 Дык што скажам на гэта? Калі Бог за нас, хто супраць нас?

Ярэмію 15:21 - Мацьвея 6:13 і ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога. Бо Тваё Валадарства, і моц, і слава навекі. Амэн.

Псальмаў 55:18 - 1 Яна 4:4 Дзеткі! Вы — ад Бога, і вы перамаглі іх, бо Той, Які ў вас, большы за таго, які ў сьвеце.

Езэкііл 30:24 - Лукі 1:51 Ён зьявіў уладу рамяном Сваім; расьсеяў ганарыстых думкамі сэрца іхняга;

Адкрыцьцё 3:18 Раю табе купіць у Мяне золата, ачышчанае ў вагні, каб ты ўзбагаціўся, і белыя шаты, каб апрануўся, і каб ня выявіўся сорам галізны тваёй; і мазьзю вочнаю памаж вочы твае, каб ты бачыў.

1 Яна 3:17 А хто мае маёмасьць у сьвеце, і бачыць брата свайго ў патрэбе, і зачыняе ад яго нутро сваё, дык як любоў Божая застаецца ў ім?

Ісая 50:4 - Лукі 21:15 Я дам вам вусны і мудрасьць, якой ня здолеюць пярэчыць, ані супрацьстаяць усе супраціўнікі вашыя.

Эфэсцаў 6:10-12 Нарэшце, браты мае, умацоўвайцеся ў Госпадзе і ва ўладзе магутнасьці Яго. 11. Апраніцеся ў-ва ўсю зброю Божую, каб маглі ўстаяць супраць хітрыкаў д'ябла, 12. бо нашая барацьба ня супраць крыві і цела, але супраць начальстваў, супраць уладаў, супраць сусьветных дзяржаўцаў цемры гэтага веку, супраць духаў зласьлівасьці ў нябёсах.

Псальмаў 18:39 - 1 Карыньцянаў 15:25 бо Яму належыць валадарыць, пакуль пакладзе ўсіх ворагаў пад ногі Свае.

2 Самуэля 22:40 - Каласянаў 1:11 дужэючы ўсякаю сілаю паводле магутнасьці славы Яго на ўсякую цярплівасьць і доўгацярплівасьць з радасьцю,

Псальмаў 89:43 - Эфэсцаў 6:13,14 Дзеля гэтага вазьміце ўсю зброю Божую, каб вы маглі супрацьстаць у дзень злы і, усё зрабіўшы, застацца стаяць. 14. Дык станьце, падперазаўшы паясьніцу вашую праўдаю, і апрануўшы панцыр праведнасьці,

Езэкііл 13:6 - Марка 13:22 Бо паўстануць фальшывыя хрысты і фальшывыя прарокі, і будуць рабіць знакі і цуды, каб зьвесьці, калі магчыма, і выбраных.

1 Карыньцянаў 14:8 І калі труба будзе даваць невыразны голас, хто пачне рыхтавацца да бітвы?

Лукі 10:19 Вось, Я даю вам уладу наступаць на зьмеяў і скарпіёнаў, і на ўсю сілу варожую, і нішто не пашкодзіць вам.

2 Карыньцянаў 7:10 Бо смутак паводле Бога робіць нязьменнае навяртаньне на збаўленьне, а смутак гэтага сьвету робіць сьмерць.

2 Цімафея 2:25,26 у ціхасьці настаўляць тых, якія працівяцца, ці ня дасьць ім Бог навяртаньня дзеля пазнаньня праўды, 26. каб яны вызваліліся з пасткі д'яблавай, які злавіў іх пад сваю волю.

Нээмія 4:15 - Дэеі 5:38 І цяпер кажу вам: адыйдзіцеся ад гэтых людзей і пакіньце іх; бо калі ад людзей рада гэтая ці справа гэтая, будзе зьнішчаная,

Псальмаў 73:24 - Якуба 1:5 Калі ж у каго з вас не хапае мудрасьці, няхай просіць у Бога, Які дае ўсім шчыра і не дакараючы, і будзе яму дадзена.

Ярэмію 1:18 - as a defenced city, and an iron pillar, and brasen walls against evil.

Псальмаў 76:3 - God break weapons & battle (Змаганьнем).

Ярэмію 6:27 - as a tower & fortress

Левіт 26:19 - God break the pride of your power; & make heaven as iron, & earth as brass: Левіт 26:37 - no power to stand in battle(Змаганьнем).

Другазаконне 23:5 God turn curse into blessing.

2 Валадараоў 19:34 God defend. Ёва 15:24 ready to battle (Змаганьнем).

1 Хронік 12:8 fit for battle (Змаганьнем).

1 Хронік 12:33,38 expert in war (Змаганьнем), keep rank in battle (Змаганьнем).